УДК 94(476–15) «1921/1939» (043.3)

# ПРАВЯДЗЕННЕ КАМАСАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ ПІНСКАГА ПАВЕТА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА ў 1921–1939 гг.

**_В.П. ГАРМАТНЫ_**
_Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,_
_г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь_

**Уводзіны.** Перш за ўсё неабходна адзначыць адсутнасць значнай комплекснай працы, прысвечанай правядзенню камасацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. і ў Пінскім павеце ў прыватнасці, у сувязі з чым увага ў першую чаргу надавалася архіўным дакументам з фондаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці [3–8]. Некаторыя звесткі аб сацыяльна–эканамічным развіцці Піншчыны ў 1921–1939 гг. і найперш за ўсё сельскай гаспадаркі змешчаны ў раённай кнізе «Памяць», але камасацыя ацэньваецца адназначна негатыўна, адзначаецца, што яна шла на карысць выключна заможнаму сялянству [9, с. 161–162].

Асобныя моманты рэалізацыі палітыкі камасацыі ў Пінскім павеце паказаны ў даследаваннях І.В. Палуяна [10] і А.А. Сарокіна [11], але азначаныя працы выдадзены ў савецкі перыяд, таму камасацыя ацэньваецца ў іх адназначна негатыўна, падкрэсліваецца, што яна ішла выключна на карысць заможнаму сялянству, а ўвага гісторыкаў засяроджваецца на паказе барацьбы сялян супраць камасацыі, што было абумоўлена ідэалагічнымі прычынамі.

Пры аналізе польскай гістарыяграфіі неабходна выдзеліць найперш за ўсё Станіслава Пачобута–Адляніцкага [13], праца якога прысвечана Навагрудскаму ваяводству, але многія даследаваныя аўтарам кнігі з’явы і праблемы мелі месца таксама і ў сельскай гаспадарцы тагачаснай Піншчыны.

Сярод прац прадстаўнікоў сучаснай беларускай гістарыяграфіі можна адзначыць артыкул В.П. Гарматнага [2], у якім паказаны асноўныя моманты ажыццяўлення камасацыі на тэрыторыі Палескага ваяводства ў азначаны перыяд. Такім чынам, на сённяшнім этапе неабходна комплекснае даследаванне палітыкі камасацыі з улікам патрабаванняў сучаснай гістарычнай навукі і выкарыстаннем шырокага кола крыніц.

На сучасным этапе ў беларускім грамадстве ідзе вострая дыскусія наконт месца і ролі фермераў у айчыннай сельскагаспадарчай вытворчасці, у сувязі з чым неабходна падрабязна вывучыць ажыццяўленне польскімі ўладамі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. камасацыі, асноўнай мэтай якой было таксама стварэнне эканамічна моцных рынкаваарыентаваных сялянскіх гаспадарак фермерскага тыпу сямейнага характару.

Тэарэтычна–метадалагічную базу даследавання склалі прынцыпы гістарызму і аб’ектыўнасці. Прынцып гістарызму дазволіў разгледзець правядзенне польскімі ўладамі камасацыі на тэрыторыі Пінскага павета ў 1921–1939 гг. у кантэксце канкрэтна–гістарычнай сітуацыі, у рамках якой ажыццяўлялася праграма аграрных пераўтварэнняў. Прынцып навуковай аб’ектыўнасці, згодна якому адлюстраванне ў гістарычнай працы мінулага павінна быць адэкватным тагачаснай рэчаіснасці ва ўсёй яго разнастайнасці і супярэчлівасці, даў магчымасць на падставе шырокага спектра дакументальных крыніц і навуковай літаратуры атрымаць найбольш верагодныя і доказныя веды аб рэалізацыі палітыкі камасацыі на Піншчыне.

**Асноўная частка.** Першыя падрыхтоўчыя мерапрыемствы па камасацыі ажыццёўлены польскімі ўладамі на тэрыторыі Заходняй Беларусі яшчэ на працягу 1919 г., але сістэмнае яе правядзенне стала магчымым толькі пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскай мірнай дамовы, па выніках якой заходнебеларускія землі (у тым ліку і Піншчына) увайшлі ў склад міжваеннай польскай дзяржавы (ІІ Рэчы Паспалітай). У адпаведнасці з прынятым у Польшчы адміністрацыйна–тэрытарыяльным уладкаваннем заходнебеларускія землі былі падзелены на ваяводствы, паветы і гміны, у выніку чаго Пінск стаў павятовым цэнтрам Палескага ваяводства. Плошча Пінскага павета ахоплівала 5 631 кв. км., колькасць насельніцтва паводле перапісу 1931 г. складала 184 305 (з іх у Пінску – 23 497, у вёсках – 149 560) чалавек. Гушчыня насельніцтва ў павеце ў 32,7 чалавек на кв. км. адпавядала сярэдняму паказчыку па ваяводству. У павеце налічваўся адзін горад (Пінск), 3 мястэчкі (Лагішын, Пагост–Загародскі, Сернікі – зараз на Украіне) і 914 вёсак. Павет падзяляўся на 14 гмін: Брадніца, Вічэўка, Дабраслаўка, Жабчыцы, Кухоцкая Воля, Лагішын, Лемяшэвічы, Марочна, Пагост–Загародскі, Парахонск, Парэчча, Пінкавічы, Угрынічы, Хайно [9, с. 157–158].

Паводле перапісу 140 288 вяскоўцаў Піншчыны ў разглядаемы перыяд былі занята ў сферы сельскай гаспадаркі (у тым ліку агародніцтва, рыбалоўства, лясная гаспадарка – 999). Сяляне

Пінскага павета пакутавалі ад недахопу зямлі, захавання значнай колькасці перажыткаў з часоў паншчыны: найперш за ўсё буйнога памешчыцкага землеўладання і існавання цераспалосіцы – наяўнасці ў многіх мясцовых сялян некалькіх невялікіх раскіданых зямельных надзелаў, што ў вельмі значнай ступені абцяжарвала становішча сялянства і садзейнічала зніжэнню паказчыкаў ураджайнасці асноўных сельскагаспадарчых культур. Некаторыя сялянскія гаспадаркі Піншчыны мелі выцянутыя ў даўжыню і вельмі вузкія надзелы, з–за чаго на некаторых з іх селяніну з канём цяжка было нават развярнуцца. Цераспалосіца падзялялася на ўнутраную (на абшары асобнай вёскі знаходзіліся надзелы толькі мясцовых сялян) і знешнюю (прысутнічалі надзелы сялян іншых вёсак) [13, s. 421].

Камасацыя, паводле меркаванняў прадстаўнікоў значнай часткі польскай эліты, павінна была ліквідаваць цераспалосіцу і стаць галоўнаю складоваю часткаю плануемай аграрнай рэформы: напрыклад, 14 чэрвеня 1923 г. у Сейме ІІ Рэчы Паспалітай абвяшчалася, што «камасацыйны закон на шляху да рацыянальнай сельскай гаспадаркі трэба трактаваць найпрост за ўсё як падмурак, як фундамент»[12, s. 126]. Закон аб правядзенні камасацыі (scalenia, ссялення) прыняты Сеймам 31 ліпеня 1923 г. [20]. У адпаведнасці з законам надзелы аднаго ўладальніка, даўжыня якіх у адносінах да шырыні складала менш як 15 разоў, аддзеленыя ад сябе надзеламі іншага ўладальніка, лічыліся раздробленымі і цераспалоснымі і падлягалі звядзенню ў адзін, адпавядаючы асновам справядлівага гаспадарання. Ініцыятарам ажыццяўлення камасацыі маглі быць уладальнікі не менш як 25 га, падпадаючых пад аб'яднанне, а калі агульны зямельны абшар не перавышаў 200 га – то ўласнікі не менш 1/10 зямлі (артыкул 14). Просьбы аб ссяленні падаваліся ў павятовую зямельную ўправу, якая павінна была на месцы высветліць сапраўдны стан рэчаў, і – ў выпадку патрабаванняў іншых органаў улады – запраектаваць абшар ссялення, які з гаспадарчых і тапаграфічных поглядаў належыць праводзіць адначасова (артыкул 15). Правадзейнае рашэнне акруговай зямельнай управы павінна было быць даведзена да ведама ўсіх удзельнікаў камасацыі і шырокай грамадскасці. Для ацэнкі грашовай вартасці сялянскіх зямель пры ссяленні стваралася Ацэначная Камісія (Komisja Szacunkowa), у склад якой уваходзілі зямельны камісар або падкамісар, спецыяльна дэлегаваны акруговаю зямельнаю ўправаю, – у якасці старшыні; землямер, які праводзіў работы па ссяленню, і мінімум трое асабіста незацікаўленых у выніках аб'яднання зямель асоб, ведаючых мясцовыя аграрныя адносіны і класіфікацыю глебы.

Для ажыццяўлення работ па камасацыі вёскі сяляне павінны былі абраць раду (савет) ссялення (rada uczestników scalenia), колькасць членаў рады залежала ад колькасці сялян вёскі і звычайна складала ад 3 да 7 чалавек. Пры правядзенні хутарызацыі сяляне павінны былі плаціць за камасацыю кожнага гектара зямлі ў залежнасці ад яе якасці [2, s. 160] (у айчыннай гістарыяграфіі замацавалася лічба звычайна ад 14 да 20 злотых за 1 га), акрамя таго яны аплачвалі складанне праектаў, правядзенне меліярацыі, перанясенне дарог, утрыманне землеўпарадчыкаў і г.д.

Працэс камасацыі быў доўгім і складаным, бо польскім уладам неабходна было правесці вялікі аб'ём падрыхтоўчых работ і скласці шматлікія нарматыўна–прававыя і тэхнічныя дакументы. Паводле ацэнак тагачасных польскіх даследчыкаў для ажыццяўлення работ па камасацыі асобнай вёскі неабходна было як мінімум 1½–2 гады, у першую чаргу для падрыхтоўкі дакументацыі і, пры магчымасці, па надзяленні дадатковаю ворнаю зямлёю мясцовых беззямельных і малазямельных сялян, а таксама тых, якія пераносілі асабістыя гаспадарчыя будынкі [13, s. 449]. За сезон два кваліфікаваных інжынера–землямера з дапаможным персаналам маглі ажыццявіць памер 1 000 га на абшары некалькіх гмін, у той час як для высвятлення ўсіх маёмасных абставін справы аб'яднання зямель патрабавалася б дзейнасць некалькіх юрыстаў [12, s. 127]. Варта падкрэсліць, што значную перашкоду на шляху камасацыі ўяўляў недахоп кваліфікаваных інжынераў, але разам з тым улады адказна ставіліся да даручэння землямерам правядзення работ па камасацыі. Так, напрыклад, 6 чэрвеня 1926 г. Міністэрствам Сельскагаспадарчых рэформ (МСГР) было забаронена Станіславу Шпадэрскаму, жыхару г. Пінска, ажыццяўляць работы па землеўпарадкаванні ў сувязі з адсутнасцю дакументаў, падцвярджаючых яго прафесійную практыку ў якасці землямера [6, Арк. 6]. Акрамя таго, сустракаліся выпадкі непаразуменняў паміж задзейнічанымі ў справе ажыццяўлення камасацыі землямерамі: напрыклад, 23 чэрвеня 1934 г. інжынер Казімір Сурэвіч паведамляў у Палескую Акруговую Зямельную Управу (ПАУЗ), што землямер Канстанцін Трафімовіч, які праводзіў камасацыю вёскі Нобель гміны Марочна, доўгі час не плаціў грошы сваім памочнікам, матывуючы гэта асабістым цяжкім матэрыяльным становішчам, але адначасова знаходзіць сродкі на гулянкі і п'янкі, любіць часта ўжываць алкаголь, што часта прыводзіць да сутычак з яго дапаможным персаналам і асабліва звольненымі непасрэдна ім Леапольдам Гашчэкам і Станіславам Залескім, якія не маюць сродкаў для таго, каб выехаць з Нобеля і ў сувязі

з гэтым рада ссялення вёскі Нобель просіць дапамагчы ім выехаць, бо тыя падрываюць аўтарытэт землямера, падбухторваюць мясцовых сялян да напісання скарг на К. Трафімовіча і ўвесь час просяць вяскоўцаў пазычыць ім грошы [3, Арк. 1зв.]. Далейшы ход справы невядомы.

Улады стараліся правесці камасацыю мірна і нават дэмакратычна: ставілі пытанне ажыццяўлення хутарызацыі вёскі на разгляд на агульным сялянскім сходзе, і калі большая палова мясцовых сялян выказвалася супраць, то на гэтых умовах камасацыя не праводзілася [2, s. 163]. Перад правядзеннем камасацыі мясцовыя ўлады складалі падрабязны план работ па яе ажыццяўленню, заключалі папярэднюю дамову з землямерам аб тэрмінах і ходзе выканання плануемых работ, умовах аплаты выкананай працы і г. д. Так, 18 кастрычніка 1924 г. у пінскую павятовую зямельную ўправу трапіла заява 62 (агульная колькасць 82) самастойных гаспадароў з вёскі Кутынь гміны Марочна з просьбаю аб аб’яднанні іх зямель з адначасовай ліквідацыяй сервітутаў.

22 кастрычніка гэтага ж года ў вёсцы адбыўся агульны сход сялян з удзелам пінскага павятовага зямельнага камісара Мар’яна Тапчэўскага, на якім было высветлена, што вёскі Кутынь I і Кутынь II уяўлялі адну адміністрацыйную, але дзве юрыдычныя адзінкі. Агульная плошча сялянскіх надзелаў у Кутынь I складала каля 460 га, а Кутынь II – прыкладна 142 га. Сялянскія надзелы размешчаны ў 12 навакольных мясцовасцях, у кожнага з сялян налічвалася па некалькі невялікіх раскіданых цераспалосных надзелаў, адлегласць паміж якімі часам дасягае 13 км. У выніку разгляду на месцы абставін справы было прынята рашэнне распачаць у азначанай мясцовасці працы па камасацыі на наступным абшары: сумесныя надзелы сялян вёсак Кутынь I і Кутынь II – каля 602 га; дзяржаўны маёнтак Планта–Зарэчная – каля 650 га, а таксама царкоўных, сервітутных і зямель, якія належалі сялянам іншых вёсак (усяго каля 1 463 га) [7, Арк. 26–28]. Ажыццяўляць камасацыю вёсак дзяржаўнымі ўладамі было даручана землямеру Канстанціну Трафімовічу, які ў хуткім часе распачаў у вёсцы сваю дзейнасць. 26 жніўня 1925 г. сялянамі вёсак Кутынь I і Кутынь II абрана мясцовая рада ссялення ў складзе Ціта Марчука, Міхаіла Марчука, Кузьмы Саўчука, Яўмена Верамейчыка, Міхаіла Татуся, Савы Янчука і Мітрафана Окача, а таксама іх наменнікі [7, Арк. 35]. 30 жніўня гэтага ж года ў якасці членаў Ацэначнай камісіі сялянамі абраны Марцін Вакуліч (жыхар вёскі Храпін), Еўдакім Надзілевіч (вёска Лакніца) і Андрэй Мацерук (вёска Залужжа), добра ведаючыя мясцовыя ўмовы гаспадарання. 22 верасня 1925 г. камісія скончыла сваю справу, склала адпавядаючы рэчаіснасці ацэначна–памяровы рэестр зямель і вызначыла яго на плане [7, Арк. 342зв.], а на наступны дзень павятовы зямельны камісар зацвердзіў землі, падлягаючыя аб’яднанню, і вызначыў накірунак новых дарог.

24 лістапада 1925 г. на чале з пінскім павятовым зямельным камісарам адбыўся сход жыхароў вёсак Кутынь I, Кутынь II і Любін I (прысутнічала 90 з 102 удзельнікаў камасацыі), на якім сялянам быў абвешчаны памярова–ацэначны рэестр і межы іх новых надзелаў. Ніхто з вяскоўцаў не выказаўся супраць, не паступіла скарг і на працягу наступных 14 дзён, таму праект камасацыі вёсак быў прызнаны правамоцным [7, Арк. 343]. Сялянам даручалася да 1 студзеня 1928 г. давесці сетку навакольных дарог да адпаведнага стана.

2 кастрычніка 1926 г. сумесна з членамі рады ссялення вёсак Кутынь I і Кутынь II землямер Трафімовіч прыступіў да вызначэння ўмоў пераходу ва ўласнасць мясцовых сялян новых надзелаў [7, Арк. 321]. 25 чэрвеня 1927 г. на месца прыбыў павятовы зямельны камісар, які на агульным сялянскім сходзе заслухаў меркаванні сялян аб праекце камасацыі і зацвердзіў яго [7, Арк. 343].

11 сакавіка 1929 г. сяляне вёскі Скуратычы гміны Парэчча падалі ў павятовую зямельную ўправу ўнёсак з просьбаю аб распачацці камасацыі ў іх вёсцы (агульны абшар каля 309,36 га). Ініцыятарамі падання былі 9 мясцовых гаспадароў, якім належала 89,57 га. Жыхары Скуратыч у сярэднім валодалі па 10–21 ворных і 5–14 лугавых надзелаў, адносіны шырыні да даўжыні якіх складалі як 1 да 1 000. У вёсцы налічвалася 22 гаспадаркі, 13 з якім неабходна было надзяленне дадатковаю зямлёю да памеру ў 5,5 га III класа ў эквіваленце, што патрабавала 33,91 га і 7 мясцовых малазямельных сялян выказалі жаданне набыцць 5,5 га зямлі ў наваколлі. Такім чынам, дзеля далейшага рацыянальнага вядзення сельскай гаспадаркі тэрмінова было неабходна ажыццяўленне камасацыі і з 18 прысутных на сходзе сялян 13 прагаласавалі ў падтрымку праекта аб’яднання надзелаў [4, Арк. 2].

26 чэрвеня 1930 г. была абрана рада ссялення вёскі Бастычы гміны Жабчыцы, а 4 кастрычніка таго ж года – Ацэначная камісія ў складзе Дзмітрыя Гусакоўскага, Емельяна Дарашэнка і іх намесніка Віктара Дарашэнка (усе жыхары навакольнай вёскі Палтаранавічы). Па выніках працы азначанай камісіі 15 лістапада 1930 г. землі сялян вёскі Бастычы былі падзелены наступным чынам: а) ворныя землі – 1 га I класа каштаваў 600 злотых, II – 450, III – 350, IV – 240, V – 100; б) лугі – I – 650, II – 400, III – 300, IV – 200, V – 100; в) багна – I – 20 і II – 5 злотых за 1 га [5, Арк. 7].



Полесгу

Паміж вяскоўцамі і ўладальнікам суседняга маёнтка «Падгацце»Васілём Бакуненка ішла спрэчка аб праве ўладання надзелам ворнай зямлі памерам 10,36 га ў «Бярозавым гаі». Ніякіх дакументаў, якія б сведчылі на карысць аднаго з бакоў знойдзена не было, таму надзел быў выключаны з абшару ссялення як спрэчны [5, Арк. 8].

Неабходна адзначыць, што многія землямеры не паспявалі своечасова выканаць вызначаныя па камасацыі працы. Напрыклад, 8 сакавіка 1928 г. паміж ПАУЗ і землямерам з Вільні Юзефам Капцом была заключана дамова аб камасацыі вёскі Кутынек гміны Марочна абшарам каля 351 га. Паводле падпісанай дамовы землямер павінен быў распачаць працу ў вёсцы не пазней 1 чэрвеня 1928 г., вызначыць вонкавыя межы абшара ссялення і скласці межавы пратакол да 25 чэрвеня (пункт «а»), да 25 жніўня 1928 г. вызначыць класіфікацыю зямель з афармленнем абагульняючага пратакола (пункт «б»I стадыя); да 10 верасня таго ж года – вылічыць агульную паверхню і кваліфікацыйны рэестр («а»), выканаць памярова–ацэначны рэестр – да 1 кастрычніка («б»II стадыя); на працягу наступных 10 дзён ад даты зацвярджэння плана землеўладання перад ажыццяўленнем ссялення скласці на першарысе праект камасацыі («а»), пасля на працягу 1½ месяца выканаць агульны план камасацыі і перадаць яго разам з кваліфікацыйным рэестрам у павятовую зямельную ўправу («б»III стадыя); пасля атрымання рашэння аб зацвярджэнні складзеных дакументаў на працягу 2½ месяца падрыхтаваць усе неабходныя дакументы для тэхнічнай рэвізіі і накіраваць іх у павятовую зямельную ўправу («а»), пасля яе ажыццяўлення вызначыць на зямлі межы плануемых надзелаў і выслаць у ПАУЗ на працягу 2 тыдняў адпаведны пратакол («б»і «в»IV стадыя); на працягу 1 месяца ад зацвярджэння скласці ўсе неабходныя дакументы па плануемым ажыццяўленні аб'яднанні зямель і выслаць іх у ПАУЗ («а»), а пасля гэтага на працягу 2 тыдняў правесці канчатковы памер зямлі са складаннем адпаведных дакументаў («б»V стадыя). За выкананне пералічаных прац Капец атрымоўваў плату ў памеры 17 злотых за 1 га скамасаванай зямлі: 10% – за выкананне прац, пералічаных у пункце «а», 5% – за пункт «б»I стадыі; 10% – за пункт «а», 15% – за пункт «б»II стадыі; 10% – за пункт «а», 25% – за пункт «б»III стадыі; 10% – за пункт «б»III стадыі; 10% – за пункты «а» і «б», 3% за пункт «в» IV стадыі; 12% – за пункты «а»і «б»V стадыі. Авансам Капцу выплачвалася 10% ад вызначанай платы (596 злотых 70 грошаў). За спазненне тэрмінаў працы землямеру пагражаў 10% штраф ад сумы аплаты за ажыццяўленне адпаведнага этапа, але спазняцца дазвалялася не больш чым на 3 месяцы, у адваротным выпадку дамова магла быць скасавана і на працягу тыдня неабходна было перадаць усе складзеныя дакументы іншаму землямеру, вярнуць усе выплачаныя раней грошы за камасацыю вёскі Кутынек, а таксама 895 злотых у якасці штрафа. Так, 25 кастрычніка 1929 г. за празмернае невыкананне тэрмінаў камасацыі вёскі Кутынек дамова з Ю. Капцом была разарвана і на працягу 7 наступных дзён яму прадпісвалася вярнуць атрыманыя 596 злотых 70 грошаў і штраф у 895 злотых (разам 1 491 злоты 70 грошаў). Капец спрабаваў абгрунтаваць затрымку сваёю хваробаю і прадставіў даведку ад лекара, але атрымаў ад ПАУЗ адмоўны адказ, у выніку чаго справа камасацыі вёскі Кутынек была перададзена землямеру Васілю Георгіеўскаму, а таксама яму даручалася выправіць усе дапушчаныя Капцом недакладнасці.

Першапачаткова камасацыя ажыццяўлялася ў Заходняй Беларусі даволі марудна з–за недахопу ў сялян фінансавых сродкаў і будматэрыялаў на перасяленне, таму з мэтаю паскарэння камасацыі 14 студзеня 1927 г. выдадзена сумеснае распараджэнне МСГР і Міністэрства Фінансаў «Аб аказанні дзяржаўнай крэдытавай дапамогі пры аб'яднанні зямель»[16]. Дзяржаўная дапамога прадастаўлялася хутаранам у форме крэдытаў на перанясенне на новае месца старых пабудоў ці ўзвядзенне новых жылых і гаспадарчых будынкаў на вызначаных надзелах; правядзенне выказанай праз зямельныя ўправы сельскагаспадарчай меліярацыі: асушэнне, абваднення, выраўноўванне і раскарчоўка зямлі, выкопванне калодзежаў і пракладванне дарог; набыццё зямельных надзелаў ад іншых удзельнікаў ссялення (для ўладальнікаў карлікавых гаспадарак); аплату тэхнічных работ па камасацыі, усталяванне права ўладання і ўрэгуляванне іпатэкі ссяляемых грунтоў (артыкул 1). Дзяржаўная крэдытная дапамога хутаранам выдзялялася з вызначаных на гэтыя мэты фондаў МСГР у форме дадатковых банкаўскіх пазык пад 4% гадавых (артыкул 3). Уладальнікам новастворaных хутарскіх гаспадарак выдаваўся банкаўскі крэдыт: 1 200 (у выключных выпадках да 2 500) злотых на перанясенне будынкаў і 600 (800) злотых на меліярацыю (артыкул 4), а таксама малазямельным гаспадарам на набыццё дадатковай ворнай зямлі.

Высокасць пазыкі ў стасунку на 1 га новаатрыманага надзела не магла перавышаць сярэднерынкавага кошту зямлі ў дадзенай мясцовасці (артыкул 5). Агульная сума крэдыту на набыццё зямлі на 1 гаспадарку не магла быць больш 1/2 сукупнага кошта ўсіх надзелаў селяніна (артыкул 6). Крэдыты выдаваліся пад іпатэчнае забеспячэнне нерухомасцю на тэрмін да 15 гадоў, а на



Полесгу

тэхнічныя работы – да 4 гадоў (артыкул 9). У выпадку неўраджаю, пажару альбо іншага стыхійнага бедства, смерці альбо цяжкай хваробы хутараніна, выплата крэдыту магла быць адтэрмінавана на 2 гады (артыкул 12). Пры афармленні крэдыту на камасацыю селяніну неабходна было заплаціць першапачатковы ўнёсак, а потым кожнае паўгоддзе (1 красавіка і 1 кастрычніка) выплачваць суму асноўнага доўгу роўнымі далямі з працэнтамі. Гербавы збор пры гэтым звычайна складаў 7 злотых 20 грошаў, яго патрэбна было заплаціць на працягу месяца з дня пераафармлення зямлі.

Аплаціць усе неабходныя работы сялянам было даволі складана, але польскія ўлады ў многіх выпадках разумелі цяжкае матэрыяльнае становішча заходнебеларускіх сялян і ішлі ім насустрач. Напрыклад, 15 лютага 1937 г. сяляне вёскі Кашавічы гміны Жабчыцы звярнуліся ў палескі ваяводскі зямельны аддзел з просьбай пазбавіць іх ад платы за правядзенне камасацыі, бо яны не маглі яе своечасова аплаціць (60% мясцовых сялян мелі надзел менш 6 га, а якасць зямлі аказалася самай нізкай на тэрыторыі гміны, акрамя таго бліжэйшы дзяржаўны лес знаходзіўся за 40 кіламетраў ад вёскі, з–за чаго сяляне не маглі самастойна пераносіць і рамантаваць уласныя пабудовы). З 90 хутарызаваных гаспадарак гэтай вёскі 60 былі новастворанымі і таму паспяховае ажыццяўленне камасацыі было немагчымым без зняцця з сялян аплаты за выкананне работ [1, с. 417]. Патрабаванні вяскоўцаў былі ўладамі часткова задаволены.

11 кастрычніка 1937 г. жыхар вёскі Ганьковічы гміны Жабчыцы Пётр Казак, на ўтрыманні якога знаходзілася 4 асобы, што таксама працавалі ў гаспадарцы, прасіў павятовую зямельную ўправу зменшыць памер выплат за камасацыю напалову ў сувязі са сваім цяжкім асабістым матэрыяльным становішчам. Селянін валодаў 5 га зямлі, з іх азімымі засеяна 1,5 га, меў 1 каня, 2 каровы, 1 казу, 7 кур, з інвентару – 1 воз, 1 плуг, 1 барану. Дом і хлеў селяніна былі ў добрым стане, крытыя саломай, і пераносіць свае пабудовы на новае месца Казак не пагаджаўся. Пасля разгляду азначанага падання павятовы стараста прыняў рашэнне на 1 год адтэрмінаваць выплаты.

Значную праблему пры ажыццяўленні камасацыі стварала неабходнасць вызначэння новай сеткі дарог і камунікацый пры адпаведнай іх шырыні.Так, напрыклад, 23 сакавіка 1939 г. землямер Мечыслаў Пётркоўскі звяртаўся ў Міністэрства камунікацый у справе перанясення пад час камасацыі вёсак Кухоцкая Воля II і часткова Жалезніцы гміны Кухоцкая Воля існуючай дарогі Кухоцкая Воля–Любешова і праектуемай чыгункі Кухоцкая Воля–Любешова. Існуючую дарогу планавалася пашырыць да 27 метраў у шырыню і прыдаць ёй статус павятовай, а таксама вызначыць яе месцазнаходжанне згодна новаатрыманымі сялянамі надзеламі і плануемым пракладваннем чыгункі. Землямер прасіў Міністэрства праінфармаваць яго аб сваім прынятым рашэнні, але далейшы ход справы невядомы [8, Арк. 30].

Польскія ўлады імкнуліся заахвоціць сялян да ўкаранення на новых гаспадарках перадавых метадаў апрацоўкі зямлі, падкрэслівалі, што сама па сабе камасацыя яшчэ не гарант паляпшэння іх матэрыяльнага становішча. З азначанаю мэтаю ўлады праводзілі з актыўным удзелам сялян рознастайныя сельскагаспадарчыя выставы–продажы і конкурсы: так, 30 верасня 1928 г. Палескае акруговае таварыства сельскай гаспадаркі (ПАТСГ) ў вёсцы Парэчча правяло дэманстрацыю дасягненняў жывёлагадоўлі, на якую з гміны Парэчча дастаўлена 76 галоў буйной рагатай жывёлы і 47 коней. Дэманстрацыя наведалі пінскі павятовы стараста В. Балдон і віцэ–прэзідэнта ПАТСГ у вёсцы Парэчча А. Я. Сянкевіч. Судзейская камісія ў складзе інспектара самакіравання В. Арды, ветрынарнага ўрача Я. Чэрэйскага і А. Пінінскага выдала пераможцам конкурса 6 пахвальных грамат, 4 плуга і 11 грашовых узнагарод [9, с. 173–174].

Такім чынам, нягледзячы на ўсе прыкладзеныя намаганні, польскаму ўраду не удалося правесці камасацыю на Піншчыне ў 1921–1939 гг. на карысць і да задвальнення ўсяго мясцовага сялянства. Напрыклад, жыхары вёскі Пучыны і некаторых іншых былі незадаволены ўмовамі ажыццяўлення камасацыі і таму на працягу некалькіх гадоў ігнаравалі праведзенае ўладамі пераразмеркаванне зямель і заставаліся жыць у вёсцы, працягваючы апрацоўваць ранейшыя надзелы [10, с. 139].

Увогуле паводле справаздачы палескага ваяводы па стану на 1 красавіка 1937 г. у Пінскім павеце былі скамасаваны 46 вёсак агульнаю плошчаю зямельных надзелаў у 69 374 га, што складала 31,3% ад патрабуемых работ. Да 1 красавіка 1938 г. уладамі планавалася скамасаваць у павеце яшчэ 21 вёску, якія ахоплівалі 38 874 га (17,5%) [17, s. 15]. Растлумачыць такія даволі нізкія паказчыкі рэалізацыі планаў па камасацыі можна вялікім аб’ёмам работ, неспрыяльнымі прыроднымі (забагненасць, невысокая ўраджайнасць і г.д.) і сацыяльна–эканамічнымі (слабою плацёжаздольнасцю мясцовага сялянства) ўмовамі, а таксама актыўнай падрыўной дзейнасцю левардыкальных сіл.

ПолесГУ

У цэлым па ацэнках тагачасных даследчыкаў рашэнне сялян на пытанне пераносу будынкаў пераважна было адмоўным, бо землі каля старых сядзіб былі больш дагледжаныя і ўгноеныя, акрамя таго перанос будынкаў патрабаваў значных намаганняў і будматэрыялаў. Звычайна сяляне пераацэньвалі вартасць старых сядзіб і адмаўляліся пераходзіць на землі на ўскраінах вёскі, ішлі на значныя саступкі сваім суседзям, найперш за ўсё ў вызначэнні межаў на іх карысць. Такімі абставінамі карысталіся пераважна маладыя, энэргічныя і ўпэўненыя ў сябе сяляне, якія згаджаліся на пакіданне старых сядзіб пры ўмове атрымання дадатковага кавалку зямлі. Дзякуючы працавітасці і настойлівасці гаспадаркі такіх сялян «на канцы палёў» праз 3–8 гадоў амаль нічым не адрозніваліся ад старых гаспадарак і нават былі лепш апрацаванымі [13, s. 453].

**Заключэнне.** Як пісаў у 1932 г. польскі інжынер Крыстын Астроўскі: «Камасацыя – сродак выпраўлення аграрнага ладу Польшчы, без якога нельга нават і думаць аб павышэнні ўраджайнасці і агульнай культуры апрацоўкі зямлі. Без яе (камасацыі) селянін не зможа стаць сапраўдным грамадзянінам дзяржавы, не будзе адукацыі і дабрабыту…». Даследчык абгрунтоўваў вялікую адказнасць дзяржавы пры ажыццяўленні камасацыі і недапушчальнасці памылак, бо ўжо раз скамасаваныя гаспадаркі будзе немагчыма скамасаваць ізноў. Пры камасацыі суседніх вёсак лепш было, каб іх цэнтр знаходзіўся на памежжы, а не паасобку, прапаноўвалася таксама веерападобнае размяшчэнне зямельных надзелаў, што на думку Астроўскага, спрыяла б поспеху камасацыі і перашкаджала далейшаму драбненню сялянскіх гаспадарак [14, s. 15, 17].

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што правядзенне камасацыі ў Пінскім павеце ў 1921–1939 гг. садзейнічала ліквідацыі цераспалосіцы, вылілася ў падтрымку эканамічна моцных гаспадарак, шырока выкарыстоўваючых передавыя метады апрацоўкі зямлі, здольных забяспечваць сябе самастойна і пастаўляць прадукты на рынак. У выніку ажыццяўлення камасацыі за кошт скарачэння колькасці межавых палосак агульная плошча сялянскіх надзелаў узрастала ад 3% да 9%, праз удасканаленне і ўдакладненне юрыдычных адносін кошт скамасаванай зямлі ўзрастаў прыкладна на 30% [15, s. 11–12].

Вызначыць дакладна грашовую вартасць сялянскіх надзелаў было даволі складана, таму ў многіх выпадках сяляне меркавалі, што іх пакрыўдзілі і патрабавалі дадатковай зямлі, а таксама пераразмеркавання ворнай зямлі і набыцця больш выгаднага надзела, што яшчэ больш ускладняла і зацягвала камасацыю. Многія мясцовыя сяляне лічылі, што камасацыя аўтаматычна палегчыць іх матэрыяльнае становішча, у той час як у рэчаіснасці яна стварала для гэтага значныя магчымасці і была толькі пачаткам справы.

Дзякуючы правядзенню камасацыі паляпшалася якасць апрацоўкі зямлі і адпаведна ўзрастала яе ўраджайнасць і агульны збор культур. Камасацыя змяншала колькасць працадзён сялянства, патрабуемых для апрацоўкі асабістага надзела, садзейнічала станаўленню капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы рэгіёна і эканамічнай дыферэнцыяцыі мясцовага сялянства, спрыяла стварэнню агульнага ўнутранага рынка, уцягванню сялян Піншчыны ў агульнадзяржаўныя таварна–грашовыя адносіны. Камасацыя стварала сялянам выдатныя магчымасці весці гаспадарку па–новаму, але не ўсе яны змаглі гэтым скарыстацца з–за адсутнасці сродкаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Документы и материалы. В 2 томах. – Т. 2. 1929–1939 / И.П. Ховратович (сост.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 1972. – 560 с.
2. Гарматны, В.П. Правядзенне камасацыі ў Палескім ваяводстве ІІ Рэчы Паспалітай (1921–1939 гг.) / В.П. Гарматны // Białoruskie Zeszyty Historyczne (Беларускі гістарычны зборнік), 2008. – № 30. – S. 162–171.
3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд. 1. – Воп. 6. – Спр. 2312а. Дело об объединении земель дер. Нобель гм. Морочно Пинского повета
4. ДАБВ. – Фонд 1 – Воп. 6. – Спр. 2318. Дело о хуторизации земель дер. Скуратычи, Пореченской гмины, Пинского повета
5. ДАБВ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 168. Решение окружной земельной комиссии о проведении укрупнения земель д. Бастыче гмины Жабчицы Пинского повета от 25 июня 1931 г.
6. ДАБВ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 457. Дело об отказе землемеру Шпадерскому Станиславу в проведении землеустроительных работ на территории Полесья за 1924 год
7. ДАБВ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 893. Дело об объединении земель мест Кутынь I и Кутынь II, гм. Морочно, пов. Пинского
8. ДАБВ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 2056. Дело об хуторизации земель дер. Кухоцкая Воля, гм. Кухоцкая Воля


Полесгу

9. Памяць : Гісторыка–дакументальная хроніка Пінскага раёна / рэдкал.: Г.К. Кісялёў [і інш.]. – Мінск : БелТА, 2003. – 621 с.
10. Полуян, И.В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. / И.В. Полуян. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.
11. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 204 с.
12. Mich, W. W obliczu wywłaszczenia. Kwestia reformy rolnej w publicystyce ziemiańskiej 1918–1939 / W. Mich. – Lublin : Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie–Skłodowskiej, 2001. – 208 s.
13. Odlanicki–Poczobutt, St. Województwo Nowogródzkie / St. Odlanicki–Poczobutt. – Wilno : Nakładem Wileńskiej Izby Rolniczej, 1936. – 498 s.
14. Ostrowski, K. Teorja i praktyka naszej komasacji / K. Ostrowski // Rolnictwo. Czasopismo poświęcone społecznym i economicznym zagadneniom wsi. – 1932. – Kwecień. – S. 15–38.
15. Rolnictwo w Polsce. Jaki jest stan rolnictwa i co rząd robi dla jego podniesienia. – Warszawa : Wydawnictwo Bezpartyjnego Bloku Współpracy z Rządem, 1930. – 32 s.
16. Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 14 stycznia 1927 r. Wydane w porozumieniu z Ministrem Skarbu o państwowej pomocy kredytowej przy scalaniu gruntów // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej (DURP). – 1927. – № 6. – Poz. 36. – S. 45–47.
17. Sprawozdanie wojewody Poleskiego na posiedżenie Rady wojewódzkiej w grudniu 1937 r. – Brześć–nad–Bugiem : Druk Związku Rezerwistów, 1937. – 78 s.
18. Tomaszewski, J. Z dziejów Polesia, 1921–1939: zarys stosunków społeczno–ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1963. – 208 s.
19. Tomczonek, Z. Ruch ludowy na Kresach Północno–wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Tomczonek. – Białystok : Wydawnictwa Politechniki Białostockiej, 1996. – 247 s.
20. Ustawa z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntów // DURP. – 1923. – № 92. – Poz. 718. – S. 1050–1056.

## COMASATION REALISATION ON THE TERRITORY OF PINSK POWET POLESIAN PROVINCE IN 1921–1939

***V.P. HARMATNY***

***Summary***

Comasation it is one of the main parts of agrarian reform which was realized by polish government in 1921–1939 on the lands of Poland and first of all Western Belarus and Western Ukraine with the aim of strep farming liquidation and intensification of agriculture. Strip farming made a big difficulties for the local peasantry, had an bad influence for the quality of land culture and as a result was the reason of decreasing crop facilities because making agriculture on the big number parts of the lands was very unsuccessful and hard.

© Гарматны В.П.

*Поступила в редакцию 9 августа 2013г.*

Полесгу